Весці БДПУ. Серыя 2. 2020. № 2. С. 35–38

*УДК* 37(476)(091)«17»

# УНІЯЦКАЯ АДУКАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ ПАВОДЛЕ «ГАШЧАНСКІХ КАНСТЫТУЦЫЙ» 1766 г.

**А. Ф. Самусік,**
*кандыдат гістарычных навук,*
*дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі БДЭУ*

Паступіў у рэдакцыю 12.12.19

*UDC* 37(476)(091)«17»

# UNIATE EDUCATION IN BELARUS ACCORDING TO “GASHCHAN CONSTITUTIONS” IN 1766

**A. Samusik,**
*PhD in History, Associate Professor of the*
*Department of Economic History, BSEU*

Received on 12.12.19

У навуковым артыкуле ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі разглядаюцца адукацыйныя палажэнні «Гашчанскіх канстытуцый» 1766 г., якія фактычна сталі першым у гісторыі ўніяцкай царквы Школьным статутам. Адзначана іх з'яўленне пад уплывам школьных рэформ езуітаў і піяр. Прааналізаваны абавязкі ў сферы арганізацыі асветы кіраўніцтва базыльянскага ордэну, а таксама патрабаванні да настаўнікаў. Разгледжаны закладзеныя ў «Гашчанскіх канстытуцыях» падыходы да агульнай пабудовы вучэбна-выхаваўчага працэсу і спецыфікі выкладання розных прадметаў у асобных класах (лацінскай і грэчаскай моў, красамоўства, філасофіі, багаслоўя, гісторыі, матэматыкі). Падкрэсліваецца ўвага ў іх да ўжывання на занятках народнай мовы і пашырэння адукацыі шырокіх колаў свецкага насельніцтва. Паказаны кампрамісны характар рэарганізацыі сістэмы базыльянскай адукацыі, у якой кансерватыўны светапогляд суседнічаў з пэўнымі педагагічнымі навацыямі.

*Ключавыя словы:* эпоха Асветніцтва, базыльянскі ордэн, «Гашчанскія канстытуцыі», кансерватыўны светапогляд, педагагічныя навацыі, вучэбна-выхаваўчы працэс.

The article for the first time in the domestic historiography considers educational clauses of “Gashchan constitutions” of 1766 which has factually become the first school statute in the history of Uniate church. It considers their appearance under the influence of Jesuit school reforms. It analyzes the responsibilities in the sphere of organization of education of administration of Basilian order as well as requirements to the teachers. It considers the approaches from the “Gashchan constitutions” to general building of education process and specificity of teaching various subjects in separate classes (Latin, Greek, Eloquence, Philosophy, Theology, History, Mathematics). The attention to their using on the classes of national language and broadening of education for broad circles of population is emphasized. The paper shows the compromise character of reorganization of the system of Basilian education where the conservative worldview was combined with certain pedagogical innovations.

*Keywords:* epoch of Enlightenment, Basilian order, “Gashchan constitutions”, conservative worldview, pedagogical innovations, educational process.

*Уводзіны.* Пасля завяршэння Паўночнай вайны вызначальным для развіцця школьнай справы на тэрыторыі Беларусі стала супрацьстаянне езуітаў і піяраў. Першыя з іх імкнуліся захаваць уласнае дамінаванне ў рэгіёне, з другімі ж звязваліся надзеі на перабудову існуючай мадэлі адукацыі ў бок яе прыстасавання пад патрэбы дзяржавы і грамадства. Як след, канкурэнтная барацьба паміж гэтымі каталіцкімі манаскімі ордэнамі прадугледжвала мадэрнізацыю навучальнага працэсу з пашырэннем «карысных для жыцця» прадметаў (матэматыка, геаметрыя, архітэктура, прыродазнаўства, сучасныя мовы) і акцэнтам на патрыятычнае выхаванне (у тым ліку праз выкладанне гісторыі) [1, с. 5, 6].

У сучаснай гістарыяграфіі разгляд змен у эвалюцыі асветы на тэрыторыі Беларусі да арганізацыі ў 1773 г. Адукацыйнай камісіі абмяжоўваецца выключна згаданымі вышэй езуітамі і піярамі, што тлумачыцца значнымі зменамі вучэбных праграм у іх школах [2, с. 260–262]. Разам з тым, такі падыход пакідае па-за межамі даследчага поля вучылішчы, што належылі іншым канфесіям, якія таксама былі вымушаны прыстасоўвацца да тагачасных педагагічных навацый.

Найперш гэта датычыцца базыльян, якія займалі важнае месца ў тагачаснай асвеце Беларусі. Сярод членаў ордэну ў сярэдзіне XVIII ст. стала ўзрастаць колькасць тых, хто станоўча ставіўся да рэформ у каталіцкіх школах і заклікаў сістэматызаваць выходныя палажэнні арганізацыі ўласнай адукацыйнай справы. Неабходнасць распрацоўкі першага ў гісторыі ўніяцкай царквы Школьнага статута падтрымалі і тыя, хто жадаў праз яго ўвядзенне «абараніць» вучнёўскую моладзь ад наваўводзін эпохі Асветніцтва. Абодва гэтыя пункты погляду знайшлі сваё ўвасабленне ў «Гашчанскіх канстытуцыях» 1766 г. Іх кампрамісны падыход зрабіў базыльянскія навучальныя ўстановы надзвычай папулярнымі ў тагачасным грамадстве, дзе імкненне да якаснай адукаванасці суседнічала з кансерватыўным светапоглядам. На жаль, змест дадзенага Школьнага статута дагэтуль застаецца па-за ўвагай як айчынных, так і замежных гісторыкаў [3, с. 96; 4, с. 34]. Пры гэтым яго ўсебаковы аналіз дазволіў бы лепш зразумець прычыны росквіту айчынных базыльянскіх школ у часы Адукацыйнай камісіі.

*Асноўная частка.* Пачатак трансфармацыі існуючых у базыльян падыходаў да арганізацыі асветніцкай справы паклала Брэсцкая кангрэгацыя ордэну 1759 г. На ёй было вырашана стварыць камісію для распрацоўкі Кодэкса канстытуцый. Дзеля гэтага абралі 13 «фарматорыяў» з ліку кіраўніцтва Рускай і Літоўскай правінцый. Сярод іншых імі сталі настаяцелі Кобрынскага і Антопальскага манастыроў А. Навасельскі і М. Касковіч адпаведна. Узначаліў камісію вышэйшы іерарх базыльян – протаархімандрыт І. Біліньскі [5, с. 299, 300].

Падрыхтаваны «фарматорыямі» Кодэкс быў адобраны на кангрэсе ў Гошчы на Валыні ў 1766 г. і ўвайшоў у гісторыю пад назвай «Гашчанскіх канстытуцый». Аднак працэс іх юрыдычнага зацвярджэння

зацягнуўся да 1791 г., калі выйшла канчатковая яго рэдакцыя. Нягледзячы на гэта, яшчэ на Брэсцкай кангрэгацыі 1772 г. вырашылі надрукаваць і разаслаць па абіцелям дадзены звод законаў, што і было зроблена ў наступным годзе. Прычым загадвалася, каб адпаведныя кнігі ў кожным манастыры: «Выразна чыталіся па суботах у трапезнай... і выконваліся... пад пагрозай пакарання…» [6, с. 269–271; 7, с. 8–10, 75].

Адукацыйныя пытанні былі сканцэнтраваны ў другой частцы «Гашчанскіх канстытуцый», першая глава якой разглядала абавязкі ў сферы асветы кіруючых колаў базыльян, другая прысвячалася школам і арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, а трэцяя асвятляла пытанні, звязаныя з функцыянаваннем навіцыятаў (установы па падрыхтоўцы кандыдатаў да ўступлення ў ордэн) [6, с. 480].

Протаархімандрыт ажыццяўляў вышэйшае кіраўніцтва ордэнскімі навучальнымі ўстановамі ўсіх тыпаў. Таксама ён абіраў кандыдатаў для замежных стажыровак і рэкамендаваў ім пэўную спецыялізацыю – старажытныя мовы, красамоўства, філасофію ці тэалогію. У лік яго абавязкаў уваходзіла і прысуджэнне вучоных ступеняў доктараў філасофіі і тэалогіі – знаёміўся з адпаведнымі дысертацыямі прэтэндэнтаў ці склікаў экзаменацыйную камісію [8, ч. 2, с. 1–10]. У сваю чаргу, правінцыялы штогод ажыццяўлялі візітацыю школ на падкантрольных ім тэрыторыях – зацвярджалі вучэбныя праграмы, экзаменавалі выхаванцаў, правяралі стан бібліятэк. Асобую ўвагу яны павінны былі ўдзяляць стану выкладання новых дысцыплін – матэматыцы, гісторыі, нямецкай і французскай моў, для якіх былі абавязаны падабраць якасныя настаўніцкія кадры [8, ч. 2, с. 16–29].

Асобна ў «Гашчанскіх канстытуцыях» агаворваліся абавязкі бібліятэкара, які павінен быў скласці каталог манастырскага кнігасховішча, адсочваць выданне новай літаратуры і прапаноўваць настаяцелю яе набыццё. Калі ж у бібліятэцы мелася некалькі экзэмпляраў кніг, то яму дазвалялася абменьваць іх у іншых манастырах. У бібліятэцы мелася і спецыяльная зачыненая шафа («карцэр»), дзе захоўваліся забароненыя кнігі – ключ ад яе быў у настаяцеля, асабіста даваўшага дазвол на права чытаць дадзеныя працы [8, ч. 1, с. 150, ч. 2, с. 97–99]. Пасада бібліятэкара часам займалася па сумяшчальніцтве. Так, у 1743 г. у Жыровіцкім манастыры бібліятэка і архіў былі даручаны настаўніку латыні, які абавязваўся: «трымаць іх у парадку… быць здольным і схільным да гэтай справы» [9, арк. 1].

Аналіз змешчаных у «Гашчанскіх канстытуцыях» патрабаванняў да школ сведчыць аб тым, што большасць з іх датычылася навучання членаў ордэна ў духоўных семінарыях. Яны набліжаліся да традыцыйнага граматыка-рытарычнага калегіума і складаліся з шэрагу класаў – гадавога падрыхтоўчага, 2-гадавога гуманітарнага, 2-гадавога рытарычнага, 3-гадавога філасофска-матэматычнага, 3- ці 4-гадавога дагматычна-схаластычнай тэалогіі [8, ч. 1, с. 145].

Адпаведна тагачаснай практыцы адзін настаўнік у базыльян адказваў за асобны год навучання, а таму павінен быў быць вельмі эрудыраваным. Так, пры выкладанні дагматычнага багаслоўя ад яго патрабавалася веданне старажытных моў, гісторыі і «крытыкі» (каментатараў антычных аўтараў). Вывучэнне Св. Пісання суправаджалася заняткамі па яўрэйскай мове, а на лекцыях па кананічным багаслоўі пэўны час адводзіўся грэчаскай мове і царкоўнаму заканадаўству. Яшчэ больш стракатым было маральнае багаслоўе, разам з якім выхаванцы засвойвалі якое-небудзь рамяство ці рукадзелле, царкоўнаславянскую мову (у тым ліку вучыліся чытаць кнігі, напісаныя скорапісам), асновы практычнай геаметрыі, геаграфіі, гісторыі і эканоміі. Філасофія ўключала курсы матэматыкі і геаметрыі. Навучанне ж у рытарычным і гуманітарным класах прадугледжвала знаёмства з нямецкай і французскай мовамі. Кантраляваў склад вучэбнай праграмы прэфект, «дасведчаны ў шматлікіх навуках» [8, ч. 1, с. 143, 144, ч. 2, с. 82–88].

Кандыдаты на настаўніцкае званне вытрымлівалі спецыяльныя экзамены. Час правядзення апошніх вызначаў правінцыял, абіраўшы 2–3 экзаменатараў з іншых манастыроў. Прэтэндэнтаў аб іх папярэджвалі загадзя, але экзаменацыйныя пытанні заставаліся тайнай і ўключалі заданні па розных прадметах (для жадаючага выкладаць багаслоўе ці філасофію налічвалася 40 тэм). Экзамен цягнуўся 2 гадзіны. Праваліўшыя яго маглі пайсці на пераздачу (не больш 2 разоў). Ордэн быў зацікаўлены ў павелічэнні колькасці настаўнікаў, а таму дазваляў тым манахам, хто прэтэндаваў на гэтыя месцы, некалькі месяцаў тры разы на тыдзень па гадзіне штодзень рыхтавацца да экзамену [8, ч. 2, с. 82–88].

Згодна «Гашчанскіх канстытуцый» паводзіны педагогаў былі дакладна распісаны: «Настаўнікі... усе найважнейшыя навукі... павінны выкладаць вусна, аднак такім чынам, каб усё пераказвалі ў строгім метадзе, добра і падрабязна тлумачылі і разбіралі... У пытаннях спрэчных, дзе можна вырашаць і так, і інакш, яны прытрымліваюцца аднаго боку, але так, каб пагаджаючыся альбо аспрэчваючы аўтараў з іншым пунктам погляду, выказваць сваё асабістае меркаванне з магчымай сціпласцю... і нават імкнуцца прымірыць розныя меркаванні. Выкладаць трэба жывым голасам, ясна і выразна тлумачыць не толькі сэнс асобных раздзелаў, але і самі словы, іх моц і значэнне... Павінны ўстрымлівацца ад пустых і бескарысных пытанняў, паведамляць вучням не ўсё, што ведаюць, а толькі самае істотнае... Павінны старацца ўдасканальваць веды прыватным чынам, сачыць за новымі сістэмамі і новыя навуковыя адкрыцці ўносіць у сваю навуку» [8, ч. 2, с. 85–88].

Падрыхтоўчы клас семінарый арыентаваўся на тых, хто быў знаёмы толькі з асновамі лацінскай граматыкі. Яе вывучэнне тут ажыццяўлялася па простых лістах Цыцэрона, але: «Лекцыя не можа перавышаць дзесяці радкоў і павінна праходзіць з адначасовым тлумачэннем на народнай мове і пасля выкладання адпаведных правіл граматыкі». Акцэнт рабіўся на арфаграфіі, інтэрпункцыі (тэорыя выкарыстання знакаў прыпынку) і спражэннях. Рабілі вучні і пераклады асобных месцаў з Цыцэрона, а таксама пачыналі засвойваць пачаткі грэчаскай мовы [10, с. 167, 168].

У гуманітарным класе настаўнік завяршаў вывучэнне лацінскай і грэчаскай граматыкі і рыхтаваў моладзь да засваення мастацтва красамоўства. На яго занятках праходзілі сутнасць асноўных правілаў рыторыкі, з аратараў чыталі творы Цыцэрона, з гісторыкаў – Ю. Цэзара, Салюстыя, Ц. Лівія і інш., з паэтаў – Вяргілія, Гарацыя, Авідыя: «І заўсёды з выключэннем тых месцаў, якія пахнуць адкідамі». Па грэчаскай мове праз дзень выкладаліся сінтаксіс і адзін з аўтараў – у першым семестры: «празаік, але з найлёгкіх, як, напрыклад, некаторыя прамовы св. Айцоў нашых Васіля і Златавуста ці іншае што-небудзь, выбранае з Ісакрата, Плутарха або Платона». У другім жа семестры праходзіліся вершы Грыгорыя Нанзіянзена, Сінезія,

Теагпіда. Пры гэтым асабліва падкрэслівалася, што «Тлумачэнне мовы павінна служыць хутчэй яе веданню, чым агульнай эрудыцыі». Па абодвух мовах былі прадугледжаны пісьмовыя практыкаванні. Па латыні неабходна было перадаць стылі Цыцэрона ці Плінія альбо напісаць сціслае апавяданне, параўнанне, хрыю (сачыненне, якое складалася з 8 частак: аргумента; яго тлумачэння; доказаў правільнасці; абвяржэння; аналагічных тэзісаў; прыкладаў, здольных вызначыць ступень дакладнасці; спасылак на аўтарытэты; высноў). Вучнёўскія ж працы па-грэчаскі найперш мелі задачу замацаваць веданне сінтаксісу [10, с. 166, 167].

У рытарычным класе вучэбная праграма прадугледжвала паслядоўнае вывучэнне тэорыі і асноўных стылей лацінскага красамоўства. Выкарыстоўваць тут дазвалялася выключна антычных аўтараў – папершаму з іх працы Цыцэрона і Арыстоцеля, а падругому – розных аўтараў, але «стыль запазычваецца з аднаго толькі Цыцэрона... павінны чытацца яго прамовы, так як яны ўяўляюць ідэальнае ўвасабленне правіл навукі, робяць апошнія больш наглядныме» [8, ч. 1, с. 147]. Для замацавання ж тэорыі неабходна было прыводзіць урыўкі з твораў, напісаных: «Славутымі аратарамі і паэтамі... у якіх яны ўдала скарысталіся тым ці іншым правілам». Пры разборы нейкага твору прафесар сцісла выкладаў яго змест, а таксама «спосаб пабудовы... паказваў, як прамоўца трапна выказваецца, як удала здабывае довады для пераканання і ўпрыгажэння, апранае іх фігурамі разважанняў і самыя гэтыя фігуры перасыпае фігурамі слоў, як бы кветкамі; нарэшце, звяртае ўвагу на самі словы, ацэньвае іх уласцівасць, вытанчанасць, багацце, прыгажосць, меру і як бы пальцам паказвае на тое, што ўзята для ўпрыгожвання пэўнага месца з рознай эрудыцыі, напрыклад з гісторыі, з баек, з народных звычаяў». Выкладаць неабходна было такім чынам, каб «вучні змаглі зразумець розніцу паміж латынню і народнай гаворкай». Таксама выхаванцы пісалі як самастойныя творы (апісанне храма, сада, поля і г. д.), так і падражалі нейкаму аўтару [10, с. 163–165].

Было прадугледжана тут і далейшае вывучэнне грэчаскай мовы – прафесар пры гэтым «павінен напоўніць вучняў веданнем аўтараў... і асабліва вучыць іх памерам складоў». Яму раілася браць «толькі старажытных аўтараў, паміж якімі, акрамя Дэмасфена, Платона, Фукідыда, Гамера і Піндара, надаць асаблівую перавагу св. Айцам Васілю, Нанзіянзену, Златавусту. І ў адзін семестр тлумачыць гісторыка альбо аратара, а ў другой – паэта. Аднак так, каб у час тлумачэння гісторыка альбо аратара раз у тыдзень праходзіўся паэт, і наадварот» [10, с. 165].

Па суботах у рытарычным класе адбываўся суцэльны паўтор пройдзенага за тыдзень. Аднаму ці некалькім вучням давалася заданне: «паўтарыць з жэстыкуляцыяй тое, што яны вывучылі з лепшых аўтараў, каб яны прывыкалі як практыкаваць памяць, так і прыстойна рабіць жэсты…» [10, с. 165, 166].

Філасофія павінна была выкладацца «адпаведна спосабу, існуючым у акадэміях», што азначала капіраванне адпаведных езуіцкіх праграм [8, ч. 1, с. 146]. На курс матэматыкі тут адводзілася не менш за паўгадзіны штодзень і ён чытаўся па Эўкліду. Напрыканцы кожнага месяца прафесар прапаноўваў вучням «якую-небудзь выдатную матэматычную праблему». Таксама штомесяц праводзілася апытанне па пройдзеным матэрыяле; «каб такім чынам больш удасканальваўся розум і разбіраліся сустракаемыя цяжкасці». Асобна прафесару гэтага класа ўказвалася, што ён павінен так падрыхтаваць сваіх выхаванцаў, «каб адсюль не выйшла для базыльянскіх школ якойнебудзь шкоды» [10, с. 163]. У дапамогу яму ўводзілася пасада карэпетытара, які «не вывучаў яшчэ філасофіі і... абавязаны быў у час сваёй карэпетыцыі вывучаць філасофію і імкнуцца да таго, каб атрымаць адабрэнне экзаменатараў». Фактычна гэта быў асістэнт, які ў будучым сам мог прэтэндаваць на права вядзення дадзенай дысцыпліны. Ён павінен быў «па-за школай дапамагаць вучням, тлумачыць цяжкія месцы, якія могуць сустрэцца ім у змесце лекцыі, ясна і зразумела, ніколькі не адыходзячы ад разважанняў і духу прафесара, прапаноўваць вучням для практыкавання розныя пытанні і кіраваць падрыхтоўкай адказаў на іх» [8, ч. 1, с. 147, 148; ч. 2, с. 88, 89].

Выкладанне багаслоўскіх навук ускладвалася на двух прафесараў, «з якіх адзін выкладае ў ранішнія гадзіны, іншы пасля абеду, абодва розныя прадметы» [8, ч. 1, с. 146]. Першы з іх вёў курс дагматычнага багаслоўя, іншы – кананічнага. Апошні даводзіў да моладзі пастановы ўсіх усяленскіх і памесных сабораў, важнейшыя папскія канстытуцыі і г. д. Да таго ж «павінен таксама раскрыць гісторыю ўчынкаў царквы ад Р. Х. да нашага часу і распавядаць яе... у добрым парадку, па стагоддзях». Таксама ён на занятках павінен быў пералічыць: «вярхоўных першасвятароў, якія кіравалі царквою, асоб, якія вызначаліся духоўнасцю і талентамі і жыўшых у тым жа стагоддзі ... і раскажа пра іншыя адметныя падзеі кожнага стагоддзя царкоўнай гісторыі» [10, с. 162]. Пры гэтым асобным магістрам чыталася маральная тэалогія, якую трэба было так выкласці, каб тут «не мелі месца меркавання пустыя і больш спрыяючыя юру, чым законам маралі» [8, ч. 1, с. 146, 147]. У гэтым жа класе вывучалі гамілетыку. Выхаванцам раілася «ведаць павучанні знакамітых людзей адносна навукі прапаведніцтва і цвёрда трымацца такога спосабу, якім могуць дасягнуць таго, каб закранаць душы, узбуджаць іх і накіроўваць туды, куды жадаюць». Іх абавязвалі: «пазбягаць жартаў, пустой гульні слоў, бескарысных упрыгожванняў сентэнцыямі, эфектных досціпаў, празмерных перабольшанняў, прамову сваю так прыстасоўваць да разумення і карысці слухачоў, каб імкнуліся не розум паказаць, а дасягнуць сапраўднага выратавання душ» [8, ч. 2, с. 79–82].

Адбываліся ў базыльянскіх семінарыях і спаборніцтвы паміж выхаванцамі. У «Гашчанскіх канстытуцыях» адзначалася, што «для засваення выкладзенага вельмі карысны практыкаванні». Таму ў іх раілася арганізоўваць два разы ў год конкурсы старшакласнікаў па напісанні вершаў «на лацінскай, грэчаскай ці іншай мове». Для вучняў рыторыкі падобнае мерапрыемства адбывалася праз падрыхтоўку прамоў на розных мовах. Пераможцы агучвалі свае творы на агульным зборы настаўнікаў і манахаў. Да таго ж лепшыя тэксты заносіліся ў спецыяльны сшытак і далей ужываліся пры выкладанні [10, № 3, с. 166]. Разам з тым, практыка публічных выступленняў вучняў існавала і раней. Вядома, што ў 1743 г. усе манахі і семінарысты у Жыровіцкім манастыры ўвечары збіраліся разам для чытання псалтыра настаўнікамі і студэнтамі класа філасофіі [9, арк. 2].

У цэлым, перад выхаванцамі з ліку членаў ордэна «Гашчанскімі канстытуцыямі» ставіліся наступныя мэты, «каб па выдаленні і выкараненні ўсялякай марнай мэты не шукаць у сваіх навуках нічога іншага, акрамя славы Божай, карысці для царквы, Айчыны і ордэна». Таксама

тут у дачыненні да вучняў гаварылася: «Хай старанна займаюцца навукамі і не думаюць пазбегнуць грознага суда Божага за некарыстанне прыроднымі талентамі, хоць бы яны ніколі не мелі магчымасці ўжыць да справы тое, чаму навучыліся» [8, ч. 2, с. 89, 90].

Была ўдзелена асобная ўвага ў «Гашчанскіх канстытуцыях» і асвеце свецкага насельніцтва. Фактычна ўпершыню за ўсю гісторыю базыльянскага ордэну яна прызнавалася не менш важнай задачай за належную падрыхтоўку манахаў. Прычым адкрыццё публічных школ тлумачылася тым, што «гэтага патрабуе любоў да Айчыны». Апошні фактар абавязваў ордэн клапаціцца аб адукацыі «свецкага юнацтва, асабліва са шляхецкага звання, якое заўсёды аказвала Айчыне важныя паслугі». З гэтай нагоды настаяцелям манастыроў рэкамендавалася трымаць прыходскія школы і вучыць у іх асновам хрысціянскага веравучэння, чытанню, пісьму, арыфметыцы і іншаму, «каб з цягам часу выхаванцы маглі быць карысны для Айчыны». Уся ўжываемая тут літаратура зацвярджалася правінцыялам – нельга дапусціць, каб «базыльянскія магістры... тлумачылі такія кнігі паэтаў ці іншых класікаў, якія могуць пашкодзіць чысціні альбо добрай маральнасці, без папярэдняга ачышчэння іх ад непрыстойных слоў і рэчаў» [8, ч. 1, с. 146, 151, 152].

*Заключэнне.* У цэлым, аналіз адукацыйнай часткі палажэнняў «Гашчанскіх канстытуцый» 1766 г. сведчыць аб комплексным разглядзе тут асноўных аспектаў функцыянавання навучальных устаноў базыльян, што дазваляе лічыць яе асобным Школьным статутам. Пры гэтым не выклікае сумненняў, што артадаксальная складовая ўсходнехрысціянскага веравызнання тут адчувалася куды мацней, чым педагагічныя навацыі з Еўропы. Так, неаднаразовыя патрабаванні прытрымлівацца выключна антычных аўтараў яўна не адпавядалі педагагічным поглядам эпохі Асветніцтва. Адсутнасць жа падрабязнага выкладу абавязкаў настаўнікаў матэматыкі, гісторыі і сучасных замежных моў можна разглядаць у якасці пэўнага кампрамісу – гэта здымала пярэчанні кансерватараў, але адчыняла перад выкладаўшымі дадзеныя «інавацыйныя» дысцыпліны шлях да большай самастойнасці ў выбары методык і падручнікаў. Асобна неабходна падкрэсліць і ўвядзенне пасады карэпетытара прафесара філасофіі – яе з'яўленне было выклікана недахопам дасведчаных выкладчыкаў, але праца асістэнта аказалася настолькі карыснай, што ўжываецца і ў сучаснай адукацыі. Такім чынам, «Гашчанскія канстытуцыі» 1766 г. яўна спалучалі педагагічныя традыцыі і новаўводзіны. У той ці іншай ступені гэта было ўласціва і іх канкурэнтам з ліку езуітаў і піяр, а потым і Адукацыйнай камісіі. Важнай жа адметнасцю тагачасных базыльянскіх школ можна лічыць увагу ў іх да народнай мовы, што цалкам адпавядала асветніцкім поглядам гэтай эпохі і дэманстравала імкненне ордэну пашыраць адукацыю ў тым ліку і ў асяроддзі менш спаланізаванага мяшчанства і сялянства.


*Літаратура і крыніцы*

1. *Самусік, А. Ф.* Арганізацыя патрыятычнага выхавання ў манаскіх навучальных установах на беларускіх землях ў XVI – сяр. XVIII ст. / А. Ф. Самусік // Весці БДПУ. – Сер. 2. – 2015. – № 4. – С. 3–7.
2. *Кузняева, С.* Адукацыя і навука / С. Кузняева // Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал. : М. Касцюк [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2008. – Т. 3 : Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII – XVIII стст.). – 2004. – С. 260–271.
3. *Марозава, С. В.* Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады) / С. В. Марозава. – Гродна : ГрДУ, 2001. – 352 с.
4. *Pidłypczak-Majerowicz, M.* Bazylianie w Koronie i na Litwie : szkoły i książki w działalnośći zakonu / M. Pidłypczak-Majerowicz. – Warszawa ; Wrocław : Państ. Wyd-wo Naukowe, 1986. – 272 s.
5. *Крачковский, Ю. Ф.* Очерки униатской церкви / Ю. Ф. Крачковский // Чтения в императорском обществе истории и древностей российских при Московском университете. – М. : Университетская типография, 1876. – Кн. 3. – С. 283–342.
6. *Петров, Н. И.* Очерк истории базилианского ордена в бывшей Польше / Н. И. Петров // Труды Киевской Духовной академии. – № 2. – С. 225–317, 480–554.
7. Constitutiones capituli Basiliani generalis Brestae : A.D. 1772. diebus Febr. celebrati cum synopsi actorum totius capituli pro notitia & commodo provinciae Littvanae vulgatae : Accedunt in Annotationibus subjunctis ea, quae in peculiari eiusdem Provinciae Capitulo constituta sunt, et vim legis pro Provincia habent. – Wilnae : Typis Basilianis, 1772. – 86 p.
8. Constitutiones examinandae et seligendae in futuris capitulis : sive constitutiones in monasterio Hoscensi formatae, ex decreto novissimi generalis Brestensis capituli pro notitia PP. et FF. provinciae Litvanae vulgatae : in 3 pars. – Wilnae : Typis Basilianis, 1773. – Pars 1. – 152 p. ; Pars 2. – 120 p. ; Pars 3. – 93 p.
9. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА). – Ф. 823. Воп. 2. Спр. 1370.
10. Codex Constitutionum Ordinis S. Basilii M. ex Sancitis antiquiorum Capitulorum Congregationis Ruthenorum & Decretorum Sanctæ Sedis collectarum, ad textum Regulæ S. Patris nostri exactus & Conformatus. – Poczajov : Typis S. Reg. M. Monasterii Poczajovien. O.S.B.M., 1791. – 264 p

*References*

1. *Samusik, A. F.* ArganizacyJa patryJatychnaga vyhavannJa w manaskih navuchal"nyh ustanovah na bjelaruskih zjemlJah w XVI – sJar. XVIII st. / A. F. Samusik // Vjesci BDPU. – Sjer. 2. – 2015. – № 4. – S. 3–7.
2. *KuznJajeva, S.* AdukacyJa i navuka / S. KuznJajeva // GistoryJa Bjelarusi : u 6 t. / redkal. : M. Kascjuk [i insh.]. – Minsk : Ekapjerspjektyva, 2000–2008. – T. 3 : Bjelarus" u chasy Rechy Paspalitaj (XVII – XVIII stst.). – 2004. – S. 260–271.
3. *Marozava, S. V.* UniJackaJa carkva w etnakul"turnym razvicci Bjelarusi (1596–1839 gady) / S. V. Marozava. – Grodna : GrDU, 2001. – 352 s.
4. *Pidłypczak-Majerowicz, M.* Bazylianie w Koronie i na Litwie : szkoły i książki w działalnośći zakonu / M. Pidłypczak-Majerowicz. – Warszawa ; Wrocław : Państ. Wyd-wo Naukowe, 1986. – 272 s.
5. *Krachkovskij, Yu. F.* Ocherki uniatskoj cerkvi / Yu. F. Krachkovskij // Chteniya v imperatorskom obshchestve istorii i drevnostej rossijskih pri Moskovskom universitete. – M. : Universitetskaya tipografiya, 1876. – Kn. 3. – S. 283–342.
6. *Petrov, N. I.* Ocherk istorii bazilianskogo ordena v byvshej Pol'she / N. I. Petrov // Trudy Kievskoj Duhovnoj akademii. – № 2. – S. 225–317, 480–554.
7. Constitutiones capituli Basiliani generalis Brestae : A.D. 1772. diebus Febr. celebrati cum synopsi actorum totius capituli pro notitia & commodo provinciae Littvanae vulgatae : Accedunt in Annotationibus subjunctis ea, quae in peculiari eiusdem Provinciae Capitulo constituta sunt, et vim legis pro Provincia habent. – Wilnae : Typis Basilianis, 1772. – 86 p.
8. Constitutiones examinandae et seligendae in futuris capitulis : sive constitutiones in monasterio Hoscensi formatae, ex decreto novissimi generalis Brestensis capituli pro notitia PP. et FF. provinciae Litvanae vulgatae : in 3 pars. – Wilnae : Typis Basilianis, 1773. – Pars 1. – 152 p. ; Pars 2. – 120 p. ; Pars 3. – 93 p.
9. Rasijski dzJarzhawny gistarychny arhiw (RDGA). – F. 823. Vop. 2. Spr. 1370.
10. Codex Constitutionum Ordinis S. Basilii M. ex Sancitis antiquiorum Capitulorum Congregationis Ruthenorum & Decretorum Sanctæ Sedis collectarum, ad textum Regulæ S. Patris nostri exactus & Conformatus. – Poczajov : Typis S. Reg. M. Monasterii Poczajovien. O.S.B.M., 1791. – 264 p.